Мапінг супрацы, асноўныя тэндэнцыі і перспектывы

Падрыхтаваны экспертамі Беларускай Рады культуры сумесна з Дацкім інстытутам культуры, 2026

Беларусь-Украіна: культурніцкі дыялог 2022-2026

DANSK KULTUR-INSTITUT
DANISH CULTURAL INSTITUTE

BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

Уводзіны 3
Каротка пра перадгісторыю 3
Літаратура 4
Медыяпраекты і кампаніі 11
Візуальныя мастацтвы 14
Фестывалі і прасторы для дыялогу 17
Музыка 23
Тэатр 26
Высновы і рэкамедацыі 28

DANSK KULTUR-INSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

Уводзіны

Гэты дакумент прапануе мапінг беларуска-ўкраінскай культурнай супрацы ў 2022–2026 гадах. Ён ахоплівае праекты ў літаратуры, тэатры, кіно, візуальным мастацтве, медыя, фестывальных праграмах і міжнародных сетках. Сабраныя прыклады паказваюць не толькі маштаб і разнастайнасць гэтай супрацы, але і тое, як змяніўся сам характар беларуска-ўкраінскага культурнага дыялогу пасля 2022 года.

Значная частка гэтых ініцыятыў стала магчымай дзякуючы валанцёрскай працы, асабістым сродкам аўтараў і арганізатараў, краўдфандынгу або невялікай донарскай падтрымцы. Пры гэтым беларуска-ўкраінская супраца часта развівалася ў межах больш шырокіх праграм падтрымкі незалежнай культуры і міжкультурнага супрацоўніцтва, а не як асобны прыярытэт.

Мапінг не прэтэндуе на вычарпальнасць: ён фіксуе больш як шэсць дзясяткаў выяўленых праектаў, але рэальны маштаб супрацы, верагодна, большы. Пры гэтым нават існая выбарка паказвае яе ўстойлівасць: дзясяткі супольных ініцыятыў былі рэалізаваныя менш чым за чатыры гады ва ўмовах вайны, эміграцыі, абмежаваных рэсурсаў і фактычнай адсутнасці сістэмнага міждзяржаўнага дыялогу.

Мэта гэтага дакумента – не толькі зафіксаваць ужо зробленае, але і вызначыць, што назапашаны досвед дазваляе сказаць пра стан беларуска-ўкраінскага культурнага дыялогу і яго далейшы патэнцыял. Выяўленыя прыклады паказваюць, што існуе значна больш шырокая аснова для супрацы, чым дазваляюць сённяшнія рэсурсы і інстытуцыйныя механізмы.

Адсюль вынікае адна з ключавых прапаноў дакумента: стварыць асобную доўгатэрміновую праграму падтрымкі беларуска-ўкраінскага культурнага супрацоўніцтва – з уласным фінансаваннем, устойлівымі партнёрствамі і≈падтрымкай не толькі асобных праектаў, але і інфраструктуры дыялогу.

Каротка пра перадгісторыю

Да 2020 года беларуска-ўкраінскія культурныя адносіны развіваліся па двух паралельных каналах. Першы быў звязаны з міждзяржаўнымі і афіцыйнымі кантактамі: удзелам у міжнародных кніжных выставах і кірмашах, днях культуры, праграмах амбасадаў і дзяржаўных культурных інстытуцый. Другі фармаваўся ў незалежным культурным полі – праз фестывалі, аўтарскія і мастацкія ініцыятывы, незалежныя пляцоўкі і супольныя праекты, якія ўзнікалі непасрэдна паміж прафесійнымі супольнасцямі.

Пасля падзей 2020 года гэтыя адносіны пачалі істотна мяняцца. Украінская інтэлектуальная і культурная супольнасць адкрыта выказала салідарнасць з беларускім грамадствам, а беларуская культура стала больш прыкметнай у незалежнай украінскай культурнай прасторы. Сведчаннем гэтага сталі, у прыватнасці, выданне кнігі Ii Ківы «Ми прокинемось іншими...», прысвечанай беларускаму досведу трансфармацыі і супраціву, і выстава беларускага супраціву «Кожны дзень» у кіеўскім комплексе «Мистецький Арсенал», якая аб'яднала працы больш як 50 беларускіх і ўкраінскіх мастакоў.

DANSK KULTURINSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

Адначасова Украіна стала адной з важных краін рэлакацыі беларускіх культурных дзеячаў. Гэта змяніла сам характар кантактаў: геаграфічная блізкасць і непасрэдная прысутнасць беларускіх творцаў і менеджараў ва ўкраінскім культурным асяроддзі спрыялі ўзнікненню новых прафесійных і асабістых сувязяў. Так фармавалася сетка кантактаў, якая пазней стала адной з асноў беларуска-ўкраінскай культурнай супрацы ва ўмовах поўнамаштабнай вайны.

Пасля пачатку поўнамаштабнай расійскай вайны супраць Украіны ў 2022 годзе міждзяржаўны канал культурнага супрацоўніцтва фактычна спыніўся. Аднак сеткі, сфармаваныя ў незалежным культурным полі, не зніклі. Наадварот, ва ўмовах вайны яны набылі новае значэнне – як каналы салідарнасці, узаемнага разумення і супольнага асэнсавання досведу Беларусі і Украіны.

Далей сабраныя праекты згрупаваныя паводле **шасці асноўных сфер:** літаратура, медыя, візуальныя мастацтвы, фестывалі і прасторы для дыялогу, музыка і тэатр. Такое групаванне дазваляе не толькі ўбачыць разнастайнасць ініцыятыў, але і вызначыць найбольш устойлівыя формы беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння.

Літаратура

Літаратурны абмен паміж Беларуссю і Украінай у апошнія гады развіваецца ў абодвух кірунках: беларускія аўтары ўваходзяць ва ўкраінскую літаратурную прастору, а ўкраінскія творы перакладаюцца і выдаюцца па-беларуску. Пры гэтым пераклад усё часцей выходзіць за межы ўласна літаратурнай практыкі. Ён становіцца інструментам культурнай камунікацыі, перадачы досведу вайны і рэпрэсій, узаемнага пазнавання і фармавання агульнай прасторы памяці.

Асабліва выразна гэта бачна ў творах, звязаных з вайной, палітычным гвалтам, памяццю і досведам супраціву. Украінскі досвед становіцца часткай сучаснага беларускага культурнага кантэксту, у той час як беларускія аўтары праз пераклады атрымліваюць магчымасць прысутнічаць ва ўкраінскай культурнай прасторы як самастойныя галасы з уласным гістарычным і сучасным досведам.

Прыведзеныя ніжэй прыклады паказваюць некалькі ўзаемазвязаных тэндэнцый: пераклад украінскай літаратуры на беларускую як форму салідарнасці і культурнага збліжэння; прысутнасць беларускай літаратуры ва ўкраінскай прасторы; фармаванне супольнага наратыву пра вайну і рэпрэсіі; а таксама паступовае пераасэнсаванне беларуска-ўкраінскай гісторыі як узаемазвязанага досведу.

Выданне «Слоўніка вайны» Астапа Слывінскага ў перакладзе з украінскай на беларускую мову Ірыны Герасімовіч (Галіяфы, 2023, у межах праекта 33 books for another Belarus)

Дакументальна-літаратурны праект украінскага паэта, перакладчыка і эсэіста **Астапа Слывінскага**, запачаткаваны ў першыя месяцы пасля

поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну ў 2022 годзе. Слывінскі быў валанцёрам у Львове і слухаў гісторыі людзей, якія ўцякалі ад вайны; пазней пачаў запісваць гэтыя сведчанні і арганізоўваць іх вакол асобных слоў, значэнне якіх вайна радыкальна змяніла.

Беларускі пераклад робіць украінскі досвед вайны часткай непасрэднага культурнага дыялогу паміж беларусамі і ўкраінцамі. Асабліва важна, што кніга даследуе, як вайна змяняе значэнні звычайных слоў: у беларускай мове яны пачынаюць рэзанаваць з уласным досведам страху, страты, выгнання, салідарнасці і жыцця ў нестабільнасці.

Бясплатна спампаваць PDF кнігі можна тут.

Выданне рамана «Салодкая Даруся» Марыі Маціёс у перакладзе з украінскай на беларускую мову (Pflaumbaum, 2023)

Трагічная сямейная сага адбываецца ў 1930–1970-х гадах на Букавіне – рэгіёне на ўкраінска-румынскім памежжы, дзе на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў мяняюцца ўлады і дзяржаўныя межы. У цэнтры гісторыі звычайныя людзі, чые лёсы аказваюцца зламанымі вайной, рэпрэсіямі і дзеяннямі дзяржаўнай сістэмы. Аўтарка падкрэслівае, што «рука кіраўніцтва» дацягнецца нават да самых аддаленых куточкаў краю і зробіць непапраўнае.

Для беларускага чытача гэты сюжэт набывае дадатковую актуальнасць: досвед Букавіны дазваляе ўбачыць, як вялікая палітыка і змена рэжымаў пранікаюць у жыццё самых звычайных людзей. Пераклад, такім чынам, стварае магчымасць суаднесці ўкраінскі гістарычны досвед з беларускім.

Ініцыятаркай выдання стала нобелеўская лаўрэатка Святлана Алексіевіч, перакладчык тэксту ананімны.

Выданне рамана «Дзеці Аліндаркі» Альгерда Бахарэвіча ў перакладзе на ўкраінскую мову («Стилос», 2025, пераклад Лэсіка Панасюка і Дарыны Гладун)

Гэта першы пераклад рамана Бахарэвіча на ўкраінскую мову і важны крок у прадстаўленні аднаго з ключавых сучасных беларускіх празаікаў ва ўкраінскай літаратурнай прасторы.

Значэнне выдання ўзмацняецца яго рэцэпцыяй: кніга атрымала шырокі розгалас і ўвайшла ў спіс найлепшых кніг года ва Украіне паводле Украінскага ПЭНа. Гэта паказвае, што беларуская літаратура можа быць цікавая ва Украіне не толькі ў кантэксце палітычнай салідарнасці, але і як самастойная літаратурная з'ява.

Пераклад таксама стварае магчымасць для ўкраінскага чытача пазнаёміцца з Беларуссю праз сучасную літаратуру, а не толькі праз палітычны дыскурс.

DANSK KULTURINSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

Прэмія Карласа Шэрмана, уручаная беларускаму паэту Андрэю Хадановічу за пераклад украінскай паэзіі

Прэмія за найлепшую перакладную кнігу, заснаваная ў гонар выдатнага літаратурнага перакладчыка Карласа Шэрмана, прысуджаецца ў Беларусі з 2016 года. Яе арганізатарамі з'яўляюцца Дабрачынная ініцыятыва «Вяртанне», Міжнародны саюз беларускіх пісьменнікаў і Беларускі ПЭН.

Для беларускай літаратурнай прасторы гэтая ўзнагарода азначае не толькі прызнанне майстэрства перакладчыка, але і значнасць перакладу як спосабу стварэння сувязяў паміж літаратурамі і культурамі. Таму сімвалічна, што галоўнымі замежнымі паэтычнымі кнігамі 2023 года для беларусаў сталі «Іншае імя любові» і «Месапатамія» Сяргія Жадана.

Беларусы могуць чытаць украінскую літаратуру і без перакладу. Аднак перастварэнне твора на беларускай мове, асабліва паэтычнага, уводзіць яго ў іншую моўную і культурную сістэму. Сам факт прызнання такіх перакладаў беларускай прафесійнай літаратурнай прэміяй сведчыць пра значнасць украінскай літаратуры для сучаснага беларускага літаратурнага поля.

Прэмія Наталлі Арсеньевай (2025) Сяргею Прылуцкаму, беларускаму паэту і грамадзяніну Украіны, за паэтычную кнігу пра вайну «Нічога нястрашнага»

Поўнамаштабнае ўварванне Сяргей Прылуцкі сустрэў у Бучы. Ён жыў там з сям'ёй недалёка ад Гастомельскага аэрапорта і каля двух тыдняў знаходзіўся ва ўмовах расійскай акупацыі, пасля чаго сям'і ўдалося эвакуявацца.

Таму паэт піша пра вайну не як знешні назіральнік: ён апісвае рэальнасць, часткай якой стаў сам. Асабліва істотна, што гэты досвед прагаворваецца па-беларуску. Беларуская мова тут становіцца мовай сведчання пра расійскую вайну супраць Украіны, а таксама мовай суперажывання і салідарнасці.

Для беларускай культуры гэта важны спосаб уключэння ўкраінскага досведу ў ўласную культурную прастору і адначасова спосаб паказаць адрозненне паміж беларускай культурай і палітыкай рэжыму. У 2025 годзе журы прэміі Наталлі Арсеньевай – адной з галоўных узнагарод за беларускамоўную паэзію – прысудзіла яе Прылуцкаму за «Нічога нястрашнага» з фармулёўкай «за голас чалавечай любові ў час вайны і бесчалавечнасці».

Такім чынам, украінскі ваенны досвед уваходзіць у сучасную беларускую паэзію не як знешняя тэма, а як частка актуальнага беларускага літаратурнага досведу.

Падборка ўкраінскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову Make Poetry, not War, апублікаваная ў інтэрнэт-часопісе Taubin да гадавіны пачатку поўнамаштабнай вайны

Праект аб'ядноўвае пераклады сучаснай украінскай паэзіі на беларускую мову. У падборцы прадстаўлены тэксты Максыма Крыўцова, Астапа

DANSK KULTUR-INSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

Слывінскага, Артура Дроня і іншых аўтараў у перакладзе беларускіх паэтаў, у тым ліку Андрэя Хадановіча.

У адрозненне ад асобнага кніжнага выдання, гэты праект паказвае ролю незалежных літаратурных медыя ў падтрымцы беларуска-ўкраінскага культурнага дыялогу. Паэзія тут выступае як форма салідарнасці, супраціву і захавання чалавечых сувязяў у час вайны.

Кніга Ігара Аліневіча «Еду ў Магадан» у перакладзе на ўкраінскую мову Іры Стасюк (2023)

Гэта турэмны нон-фікшн, напісаны Аліневічам падчас яго першага зняволення ў 2010–2015 гадах. У кнізе ён апісвае беларускую карную і пенітэнцыярную сістэму, турэмны побыт, механізмы ціску і ўласны досвед палітычнага зняволення. Упершыню кніга выйшла ў 2013 годзе і ў тым жа годзе атрымала першую прэмію імя Францішка Аляхновіча за найлепшы твор, напісаны ў зняволенні.

Украінскі пераклад і друк у 2023 годзе арганізаваў беларускі добраахвотнік і анархіст Яўген Жураўскі («Салам»), які тады ваяваў ва Украіне; пераклад зрабіла Іра Стасюк, рэдагаваў Аляксей Салянік.

Тут літаратурны пераклад выконвае выразную інфармацыйна-асветніцкую функцыю: ён дапамагае ўкраінскаму грамадству лепш зразумець беларускую рэпрэсіўную сістэму і яе механізмы.

Лёс Ігара Аліневіча сімвалічны для найноўшай гісторыі Беларусі: першы раз яго асудзілі ў 2011 годзе на 8 гадоў, у 2015-м ён выйшаў па памілаванні, а ў 2020 годзе быў зноў затрыманы. У снежні 2021 года яго асудзілі на 20 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму па «справе анарха-партызан».

Дакументальная кніга беларускіх журналістаў Кацярыны Андрэевай і Ігара Ільяша «Беларускі Данбас» (Харкаў, Фоліо, 2020 — рускамоўнае выданне; 2021 — выданне на ўкраінскай мове)

Кніга стала вынікам шматгадовага журналісцкага расследавання ўдзелу беларусаў у вайне на Данбасе. Аўтары размаўлялі з беларусамі, якія апынуліся па розныя бакі фронту, і даследавалі ролю беларускіх спецслужбаў, дзяржаўных структур і асабіста Лукашэнкі ў кантэксце вайны на ўсходзе Украіны.

Яшчэ задоўга да поўнамаштабнага ўварвання кніга паказала, што вайна ва Украіне не была для Беларусі далёкай чужой падзеяй: беларусы ўдзельнічалі ў ёй па абодва бакі фронту, а сама Беларусь была ўключаная ў палітычныя і сілавыя працэсы вакол канфлікту.

У Беларусі кніга была прызнаная «экстрэмісцкай» і забароненая. Кацярына Андрэева — адна з вядомых беларускіх журналістак-палітвязняў. Пасля пяцігадовага зняволення яна была прымусова вывезеная з Беларусі; яе муж і калега Ігар Ільяш асуджаны на 4 гады калоніі за «дыскрэдытацыю Рэспублікі

Беларусь» і «садзеянне экстрэмісцкай дзейнасці» і дасюль знаходзіцца ў турме ў Беларусі.

Кніга вершаў Дзмітрыя Строцава «Украінскі іканапіс: паэтычны рэпартаж 2014–2025 гадоў» у перакладзе на ўкраінскую мову (Кіеў, Дух і Літера, 2025). Перакладчыкі — Наталія Бельчанка, Вікторыя Вакуленка і Сяргей Жадан

Гэта другая ўкраінская кніга беларускага паэта Дзмітрыя Строцава; першая — «Пыл, што танчыць» — выйшла ў 2020 годзе. У новую кнігу ўвайшлі вершы, напісаныя цягам больш як дзесяці гадоў — ад Майдану і пачатку вайны ў 2014-м да 2025 года.

Сам Строцаў вызначае такую форму як «паэтычны рэпартаж»: паэзія тут працуе як непасрэдная фіксацыя падзеі, чалавечага голасу і стану.

Кніга важная сваёй працяглай часавай перспектывай: гэта паэтычная хроніка адносінаў беларускага аўтара з Украінай на працягу 2014–2025 гадоў. У гэтым сэнсе «Украінскі іканапіс» паказвае адваротны кірунак культурнага абмену: украінскі чытач атрымлівае магчымасць убачыць Украіну праз погляд беларускага паэта, які становіцца не толькі аб'ектам прадстаўлення, але і інтэрпрэтатарам украінскага досведу.

Паэтычная кніга-фотаальбом Алеся Плоткі, Алеся Пілецкага і Станіслава Крупажа Bloodlands 20/22 Belarus/Ukraine (Лондан, Skaryna Press, 2023) і яе ўкраінская версія «Сож» (Драгобыч, Коло, 2025, пераклад Вячаслава Лявіцкага)

Праект спалучае паэзію і фатаграфію. У ягоным цэнтры — «крывавыя землі» Беларусі і Украіны, іх розныя гістарычныя траекторыі і сучасныя шляхі дэкаланізацыі. Акрамя аўтарскіх твораў, беларускае выданне змяшчае пераклады ўкраінскіх літаратараў: Івана Сэмесюка, Тані Радзівонавай, Вячаслава Лявіцкага, Лэсыка Панасюка і Angie Siveria.

Украінская версія атрымала назву «Сож» — у гонар ракі, якая звязвае Беларусь і Украіну і адначасова становіцца метафарай мяжы, пераходу і «шэрай зоны» паміж дзвюма прасторамі.

Праект важны тым, што выходзіць за межы ўласна літаратурнага абмену і стварае агульную беларуска-ўкраінскую візуальна-літаратурную прастору. У «Сожы» адбываецца не проста пераклад, а перастварэнне і пераасэнсаванне праекта для іншай аўдыторыі: Вячаслаў Лявіцкі працаваў з тэкстам як з жывым літаратурным матэрыялам, месцамі прапаноўваючы ўласныя інтэрпрэтацыйныя рашэнні, з якімі аўтар пагадзіўся.

Пераклады ўкраінскай паэзіі, што публікуюцца выдавецтвам hochroth Minsk

Незалежнае беларускае выдавецтва hochroth Minsk, заснаванае паэтам і выдаўцом Дзмітрыем Строцавым у Берліне, сістэматычна знаёміць

беларускамоўных чытачоў з сучаснай украінскай паэзіяй. У 2023–2026 гадах выйшлі чатыры кнігі: «Іншае імя любові» Сяргія Жадана (2023, пераклад Андрэя Хадановіча), «Human Right (Права чалавека)» Юрыя Іздрыка (2025, пераклады Алеся Плоткі і Наталлі Русецкай), «Крык на тэрыконе» Максыма Крыўцова (2026, пераклад Вольгі Ермалаевай Франко) і «Рэчы, за якія можна трымацца» Ірыны Шувалавай (2026, пераклад Андрэя Хадановіча). Гэтыя аўтары прадстаўляюць розныя пакаленні і мастацкія напрамкі сучаснай украінскай літаратуры, але іх творчасць аб'ядноўвае ўвага да чалавечай годнасці, свабоды, любові, памяці, страты і пошуку апоры ў часы гістарычных узрушэнняў. Для беларускага чытача асабліва значным можа быць сугучча ўкраінскага досведу вайны і супраціву з беларускім досведам рэпрэсій, выгнання і барацьбы за захаванне ўласнай ідэнтычнасці.

#FreeAllWords

Міжнародны літаратурны і перакладчыцкі праект, заснаваны пад эгідай Еўрапейскай рады пісьменнікаў (European Writers' Council, EWC) па ініцыятыве Міжнароднага саюза беларускіх пісьменнікаў, швейцарскага аб'яднання аўтараў і перакладчыкаў A*dS і нарвежскага саюза пісьменнікаў Forfatterforbundet. Ініцыятыва накіраваная на падтрымку беларускіх і ўкраінскіх аўтараў, якія працуюць ва ўмовах вайны, вымушанай эміграцыі, палітычных рэпрэсій, цэнзуры. Праект забяспечвае ганарары пісьменнікам і перакладчыкам, пераклады літаратурных твораў на замежныя мовы, а таксама іх распаўсюджванне сярод міжнароднай аўдыторыі.

Паводле звестак 2025 года, у межах праекта былі сабраныя і перакладзеныя 212 тэкстаў 46 беларускіх і ўкраінскіх аўтараў на 50 моў з удзелам 51 перакладчыка з 21 краіны. Праект спрыяе захаванню і развіццю беларускай і ўкраінскай літаратур, іх міжнароднай бачнасці, прафесійнай падтрымцы аўтараў і перакладчыкаў, а таксама культурнай салідарнасці паміж Беларуссю, Украінай і еўрапейскай літаратурнай супольнасцю.

Перакладчыцкая майстэрня: украінская літаратура 1920–1930-х гадоў і сучаснасці

Тэматычная сустрэча Перакладчыцкай майстэрні Беларускага ПЭНа пад кіраўніцтвам паэта і перакладчыка Андрэя Хадановіча, прысвечаная ўкраінскай літаратуры — ад «Расстралянага адраджэння» 1920–1930-х гадоў да сучаснай ваеннай паэзіі.

Запрошаная экспертка, украінская літаратуразнаўца Ярына Цымбал, прадставіла міжнародны праект рэканструкцыі страчанага рамана «Югурта» рэпрэсаванага ўкраінскага пісьменніка Майка Ёгансэна. Да працы над рэканструкцыяй і перакладам твора на розныя мовы далучыўся і беларускі перакладчык Андрэй Хадановіч. У межах майстэрні ўдзельнікі таксама аналізавалі беларускія пераклады твораў украінскага футурыста Геа Шкурупія, у тым ліку аповесці «Штаб смерці» ў перакладзе Мірона Вітушкі, а таксама паэзіі сучасных украінскіх аўтараў — Максыма Крыўцова, паэта і вайскоўца, які загінуў на вайне, і Валерыя Пузіка, пісьменніка, мастака і вайскоўца.

Дзейнасць перакладчыцы Вольгі Ермалаевай Франко

Беларуская перакладчыца Вольга Ермалаева Франко (Воля Франко) займаецца папулярызацыяй украінскай літаратуры і культуры ў Бразіліі. У суаўтарстве з Патэрсанам Франко Костам (Paterson Franco Costa) пераклала на партугальскую мову тры кнігі ўкраінскіх пісьменнікаў: «Вірші з бійниці» Максыма Крыўцова (2025), «Гемінґвей нічого не знає» Артура Дроня (2026) і «Погляд Медузи» Любко Дэрэша (2026). Усе выданні выйшлі ў выдавецтве Editora Rua do Sabão пры падтрымцы праграмы Translate Ukraine. Таксама выступіла суарганізатаркай і перакладчыцай Дзён украінскага кіно (2026), якія ахапілі восем гарадоў Бразіліі, і мультымедыйных выстаў, прысвечаных творчасці Максыма Крыўцова (2025–2026). Яе дзейнасць спрыяе міжнароднаму прасоўванню ўкраінскай літаратуры і культуры, а таксама развіццю беларуска-ўкраінскага культурнага супрацоўніцтва.

«Пакаленне Чарнобыля / Покоління Чорнобіля» — беларуска-ўкраінская літаратурная анталогія (Pflaumbaum, 2026)

Беларуска-ўкраінскі літаратурны праект незалежнага жаночага выдавецтва «Пфляўмбаўм», прымеркаваны да 40-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Укладальніцамі анталогіі выступілі беларуская пісьменніца Вольга Касцюк і ўкраінская даследчыца культуры, куратарка і пісьменніца Катарына Батанава. Выданне аб'яднала 20 мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў беларускіх і ўкраінскіх аўтарак, сярод якіх Вольга Гапеева, Таня Арцімовіч, Вольга Бубіч, Вольга Ермалаева-Франко, Ярына Груша, Тамара Гундорава, Святлана Матвіенка і іншыя. Беларускія тэксты адбіраліся праз адкрыты конкурс, на які паступілі 42 заяўкі. Анталогія выйшла ў Вільні ў 2026 годзе, тэксты апублікаваныя на мовах арыгіналаў — беларускай і ўкраінскай. Адметнасць праекта — у супольным асэнсаванні Чарнобыльскай катастрофы з дзвюх нацыянальных перспектыў: беларускія і ўкраінскія аўтаркі звяртаюцца да агульнай гістарычнай траўмы, даследуючы тэмы экалагічнай катастрофы, калектыўнай памяці, страты дому, вымушанай міграцыі і палітычнага супраціву.

«Antares. Анталогія ўкраінскага Расстралянага адраджэння»

Беларуска-ўкраінскі літаратурны праект, прысвечаны захаванню і папулярызацыі спадчыны ўкраінскіх пісьменнікаў 1920–1930-х гадоў, якія сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. Укладальнік анталогіі — беларускі паэт і перакладчык Алесь Плотка, выдавец — ініцыятыва «Пурпурная майстэрня». У кнізе ўпершыню па-беларуску пад адной вокладкай сабраныя творы 26 украінскіх аўтараў, сярод якіх Мыкола Зэраў, Мыхайль Сэмэнка, Майк Ёгансэн, Геа Шкурупій і Мыкола Хвылёвы. Паэзія прадстаўленая ў двухмоўным фармаце — украінскія арыгіналы побач з беларускімі перакладамі. Над перакладамі працавалі Ева Арлова, Ганна Янкута, Мікола Грэшны, Віктар Жыбуль, Артур Камароўскі і іншыя. Асобная адметнасць — уключэнне гістарычнага перакладу беларускага паэта Алеся Дудара, расстралянага ў 1937 годзе, які сведчыць пра даўнія літаратурныя сувязі паміж дзвюма краінамі.

DANSK KULTURINSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE

У супрацоўніцтве з украінскай студыяй Audiostories Production (Львоў) створаная таксама беларускамоўная аўдыяверсія «Antares», у якой творы ў перакладзе Алеся Плоткі гучаць у яго ўласным выкананні. Аўдыяальбом выйшаў 15 кастрычніка 2026 года і даступны на Bandcamp. Праект актуалізуе супольны беларускі і ўкраінскі досвед знішчэння нацыянальных культурных эліт савецкім рэжымам, аднаўляе гістарычную пераемнасць літаратурных кантактаў і развівае сучаснае беларуска-ўкраінскае супрацоўніцтва ў галіне перакладу, кнігавыдання і аўдыялітаратуры.

Выданні ўкраінскай літаратуры ў беларускім выдавецтве Skaryna Press (Лондан, 2022–2026)

Беларускае выдавецтва Skaryna Press, заснаванае ў Лондане, з пачатку сваёй дзейнасці надае ўвагу перакладам украінскай літаратуры на беларускую мову. Першай кнігай выдавецтва ў 2022 годзе сталі «Бэйруцкія апавяданьні» Агатангела Крымскага — класіка ўкраінскай літаратуры, выбітнага ўсходазнаўцы, аднаго з заснавальнікаў Акадэміі навук Украіны, які меў у тым ліку беларускія карані. Твор, упершыню апублікаваны ў 1906 годзе, знаёміць чытача з шматкультурным і шматмоўным светам Блізкага Усходу, закранаючы пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці, культурнай разнастайнасці і каланіялізму. Беларускі пераклад Уладзіслава Гарбацкага быў намінаваны на ўкраінскую перакладчыцкую прэмію Drahomán Prize.

У 2023 годзе Skaryna Press перавыдала «Anarchy in the UKR» Сяргія Жадана ў абноўленым беларускім перакладзе Алега Жлуткі (першае беларускае выданне выйшла ў Мінску ў 2012 годзе). Гэта аўтабіяграфічная проза пра познесавецкую і постсавецкую Украіну, станаўленне новага пакалення, пошукі свабоды і пераасэнсаванне ўласнага мінулага.

У 2026 годзе выдавецтва выпусціла «Хемінгуэй нічога не ведае» Артура Дроня — адну з найбольш заўважных украінскіх кніг пра сучасную вайну, адзначаную прэміяй імя Юрыя Шавялёва за найлепшую кнігу эсэістыкі 2025 года. Аўтар, які ў 2022 годзе далучыўся да УСУ, атрымаў раненне на фронце, піша пра вайну з асабістага досведу, паказваючы франтавы побыт, страх, смерць, сяброўства, веру і любоў без гераічнага пафасу. Кніга стала бестселерам ва Украіне і ў 2026 годзе перакладаецца на шэраг замежных моваў, у тым ліку беларускую.

Гэтыя выданні прадстаўляюць украінскую літаратуру розных эпох — ад класікі пачатку XX стагоддзя да сучаснай ваеннай прозы. Яны дапамагаюць беларускаму чытачу глыбей пазнаёміцца з украінскай гісторыяй, культурай і грамадскім досведам, а таксама асэнсаваць блізкія для абедзвюх краін пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці, дэкаланізацыі, гістарычнай памяці і барацьбы за свабоду.

Медыяпраекты і кампаніі

Пераасэнсаванне ўзаемных уяўленняў і стварэнне прасторы для прамой размовы — важныя аспекты супрацы ў медыя. Частка ініцыятыў працуе

з тым, як Беларусь і беларусы прадстаўлены ва ўкраінскай інфармацыйнай прасторы, іншыя — з агульнай гісторыяй, мовай, памяццю, русіфікацыяй і сучасным досведам вайны і эміграцыі. Медыя тут выступаюць не проста каналам распаўсюду інфармацыі, а інструментам, які дапамагае карэктаваць спрошчаныя вобразы і паказваць больш складаную карціну адносінаў паміж дзвюма супольнасцямі.

Асобна важна, што ў гэтым блоку прысутнічаюць розныя ўзроўні камунікацыі: ад шырокіх інфармацыйных кампаній да доўгіх інтэрв'ю, падкастаў і рэгулярных выданняў. Гэта дазваляе працаваць і з масавай аўдыторыяй, і з больш складанымі тэмамі, якія патрабуюць часу і нюансаванага абмеркавання. Асаблівую ролю адыгрываюць фарматы, у якіх беларускія і ўкраінскія галасы прысутнічаюць на роўных, а размова вядзецца на нацыянальных мовах і не пазбягае рознагалоссяў.

У выніку медыйныя праекты фармуюць важны пласт адносінаў — прастору ўзаемнага тлумачэння. Яны дапамагаюць зрабіць беларускую тэматыку часткай украінскага публічнага поля, а ўкраінскі досвед — часткай беларускай культурнай і інтэлектуальнай размовы. Тут асабліва заўважны пераход ад аднабаковага інфармавання да больш складанага фармату, дзе бакі не толькі распавядаюць пра сябе, але і вучацца слухаць, удакладняць і супастаўляць уласныя досведы.

Інфармацыйная кампанія #BelaruswithUkraine

Кампанія па фармаванні негатыўнага стаўлення беларусаў да расійскай ваеннай агрэсіі супраць Украіны была ініцыяваная шэрагам беларускіх незалежных арганізацый і каардынавалася Беларускай Радай культуры. З пачатку сакавіка 2022 года каманда праекта планамерна дакументавала гісторыі дапамогі, падтрымкі і супрацоўніцтва беларусаў і ўкраінцаў ва ўмовах вайны.

У межах кампаніі ствараліся інфаграфіка «Беларусы – не рэжым», відэаролікі, анімацыя, а таксама інтэрв'ю з вядомымі беларусамі і ўкраінцамі. У сукупнасці гэтыя матэрыялы паказвалі маштаб беларуска-ўкраінскай салідарнасці і супрацьстаялі спрошчанаму ўспрыманню беларускага грамадства як саўдзельніка расійскай агрэсіі. Сумарны ахоп матэрыялаў пра дапамогу беларусаў украінцам ва ўкраінскіх медыя і паблiках склаў больш за 3,2 млн карыстальнікаў.

Такім чынам, кампанія стала адным з першых сістэмных медыйных адказаў на праблему ўспрымання беларусаў ва ўкраінскай інфармацыйнай прасторы пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну.

Медыяпраект «Трызуб і Пагоня» культурна-асветніцкага партала «Будзьма беларусамі!»

Праз папулярны гістарычны фармат праект распавядае пра супольнае мінулае беларусаў і ўкраінцаў без расійскай імперскай оптыкі. Відэа паказваюць як агульныя элементы гісторыі, так і адрозненні ў фармаванні

беларускіх і ўкраінскіх нацыянальных наратываў, дапамагаючы ўспрымаць Беларусь і Украіну як дзве самастойныя, але гістарычна блізкія культуры.

Вядоўца Кацярына Ваданосава і аўтар канцэпцыі Алесь Кіркевіч перакладаюць складаныя тэмы дзяржаўнасці, нацыянальнага адраджэння, сімвалаў і гістарычнай памяці на мову, зразумелую шырокай аўдыторыі. Гэта дазваляе выводзіць беларуска-ўкраінскую гістарычную тэматыку за межы акадэмічнай дыскусіі і рабіць яе часткай папулярнага культурнага кантэнту.

Важная асаблівасць праекта — даступны медыйны фармат. У сённяшнім кантэксце «Трызуб і Пагоня» выконвае функцыю інструмента ўзаемнага пазнання і дэімперыялізацыі гістарычнага погляду – без пасярэдніцтва расійскага гістарычнага наратыву.

Вялікае інтэрв'ю Алеся Плоткі на YouTube-канале Ukrainer

Адзін з прыкладаў выхаду беларускай культурнай тэматыкі ў вялікі ўкраінскі медыйны фармат. Амаль дзвюхгадзінная размова адбылася ў межах праекта «Моўнае пытанне», дзе асобная ўвага надаецца мовам, якім пагражае знікненне ва Украіне, у тым ліку беларускай.

У гэтым выпуску размова вядзецца па-украінску і будуецца вакол беларускага досведу: рэпрэсій, русіфікацыі і культурных стратаў, сучасных выклікаў эміграцыі і палітычнага ціску, а таксама зменаў у моўнай сітуацыі. Асобнае месца займае тэма перакладу як спосабу культурнага дыялогу і ўзаемнага разумення.

Беларуска-ўкраінскі падкаст Rakamakafo

Падкаст, які выходзіць з 2024 года і будуецца як размова двух людзей з розных краін, што сустрэліся ў эміграцыі і выявілі шмат агульнага ў сваім досведзе. Яго задумка з'явілася з агульнага для многіх беларусаў разумення недахопу кантэнту, які б яднаў, тлумачыў, даваў магчымасць паразважаць і прыслухацца. Суаўтары – украінка Ірына Домненка, спецыялістка па стратэгічных камунікацыях, адукацыі і культурнай дэкаланізацыі, і Сяргей Кастрама – беларускі грамадзянскі актывіст і праектны менеджар з Прагі. Прынцыпова важная асаблівасць праекта – вядоўцы размаўляюць па-ўкраінску і па-беларуску. Тэмы таксама ляжаць на скрыжаванні двух досведаў. Аўтары абмяркоўваюць і складаныя, часам балючыя разыходжанні ў гістарычным досведзе, палітыцы і ўзаемным успрыманні. Напрыклад, асобныя выпускі прысвечаныя таму, чым адрозніваецца беларуская і ўкраінская памяць пра Чарнобыль, як вайна змяніла ўкраінскую культуру, як развіваць кантэнт на нацыянальных мовах і як глядзець на расійскую культурную спадчыну з дэкаланіяльнай перспектывы.

Такім чынам, Rakamakafo стварае не проста медыйны кантэнт пра Беларусь і Украіну, а прастору роўнай размовы, у якой дзве мовы, два грамадствы і два гістарычныя досведы могуць непасрэдна сустракацца і абмяркоўваць як агульнае, так і адрознае.

Газета «Вісник»

«Вісник» — валанцёрская ўкраінскамоўная газета пра Беларусь і беларусаў, якая рэгулярна выходзіць ва Украіне. Выданне працуе як інфармацыйная пляцоўка Цэнтра супрацоўніцтва беларусаў і ўкраінцаў і асвятляе тэмы беларускай грамадзянскай супольнасці, палітвязняў і рэпрэсій, беларускай гісторыі, валанцёрскіх ініцыятыў, дзейнасці беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне і кантактаў паміж дзвюма супольнасцямі.

На ліпень 2026 года выйшла 53 нумары. Газета існуе ў друкаванай і электроннай версіях, а наклад друкаваных выпускаў фармуецца за кошт ахвяраванняў. Асноўная онлайн-пляцоўка газеты – яе Telegram-канал.

Газета рэгулярна ўводзіць беларускую тэматыку ва ўкраінскую інфармацыйную прастору і фармуе паслядоўную карціну Беларусі праз гісторыі людзей, грамадзянскія ініцыятывы, культурную памяць і сучасныя падзеі. Асабліва важна, што гэта ўкраінскамоўнае выданне: беларускія тэмы становяцца часткай звычайнага ўкраінскага медыйнага чытання, а не застаюцца ўнутры беларускай супольнасці.

Візуальныя мастацтвы

Беларуска-ўкраінскі культурны дыялог у візуальных мастацтвах развіваецца не ў адным, а адразу ў некалькіх фарматах. Адны праекты працуюць як сведчанне і форма салідарнасці — напрыклад, фатаграфічны праект Яўгена Жураўскага або выжыванка Руфіны Базловай. Іншыя ствараюць інфраструктуру для доўгатэрміновай супрацы — як Antiwarcoalition.art ці рэзідэнцыі Mochnarte. Яшчэ адзін важны кірунак — удзел беларускіх мастакоў у буйных міжнародных і ўкраінскіх праектах, дзе беларускі досвед становіцца часткай шырэйшай размовы пра вайну, памяць, імперыю, міграцыю і дэкаланізацыю.

Гэтыя прыклады сведчаць пра паступовы пераход ад разавых жэстаў падтрымкі да больш устойлівых прафесійных сувязяў. Важна, што супраца адбываецца не толькі праз дэманстрацыю гатовых твораў, але і праз сумесную працу, рэзідэнцыі, куратарскія сеткі, архівы, міждысцыплінарныя праекты. Такім чынам, візуальнае мастацтва становіцца не толькі сродкам выказвання, але і прасторай, дзе фармуюцца новыя сувязі паміж культурнымі супольнасцямі.

Міжнародны мастацкі рух Antiwarcoaliton.art

Antiwarcoalition.art функцыянуе адначасова як адкрыты архіў антываеннага мастацтва і сетка салідарнасці. Важнай часткай дзейнасці сталі афлайн-праекты, у тым ліку выстава «Пачуццё бяспекі» ў Харкаве – горадзе, які стаў адным з сімвалаў украінскага супраціву. Правядзенне выставы непасрэдна ва ўмовах вайны надало праекту дадатковае значэнне як форме культурнай прысутнасці і падтрымкі. «Пачуццё бяспекі» атрымала міжнароднае прызнанне і была намінаваная на Нацыянальную прэмію Украіны імя Тараса Шаўчэнкі – адну з найбольш прэстыжных культурных узнагарод краіны.

Беларускія мастакі на Кіеўскай біенале - 2025

Сярод удзельніц – мастачкі Марына Напрушкіна, Воля Сасноўская і Ала Савашэвіч – аўтаркі, якія сёння працуюць у міжнародным кантэксце і па-за межамі Беларусі.

Беларусь у межах праекту не прадстаўленая як дзяржава ці асобная культурная сцэна, але прысутнічае праз незалежных мастакоў як частка шырэйшага ўсходнееўрапейскага і постсавецкага досведу. У такім фармаце беларускае выказванне ўключаецца ў агульную размову пра вайну, імперыю, памяць і дэкаланізацыю – разам з украінскімі і іншымі еўрапейскімі аўтарамі, а не ў ізаляцыі. Гэта важна як прыклад мадэлі, у якой беларускае мастацтва не ізалюецца ў асобную «беларускую тэму», а становіцца часткай агульнай размовы пра досвед Усходняй Еўропы.

Сама Кіеўская біенале 2025 года таксама была пабудаваная не як адна цэнтральная выстава, а як сеткавы праект у розных гарадах і краінах, які спалучаў мастацкія падзеі з дыскусіямі і палітычным мысленнем. У гэтым кантэксце ўдзел беларускіх мастакоў стаў формай уключэння беларускага досведу ў транснацыянальны культурны дыялог рэгіёна.

Выстава «Dom Możliwy / A Possible Home» (Познань, 2025)

Беларуска-ўкраінска-польская выстава, што праходзіла ў Познані ў снежні 2025 года, аб'яднала мастакоў з Беларусі, Украіны і Польшчы, чый асабісты і прафесійны досвед звязаны з гэтым горадам. У цэнтры праекта была тэма дому — як месца, якое чалавек выбірае сам або вымушаны шукаць нанова праз вайну, пераезд, эміграцыю і страту ранейшага жыцця. Адначасова выстава звярталася да пытанняў адаптацыі, суіснавання і стварэння новых супольнасцяў.

Познань займае асаблівае месца ў жыцці беларускай мастацкай супольнасці: тут сфармаваліся асяродкі, што яднаюць мастакоў розных пакаленняў, а беларуская мастацкая сцэна актыўна ўзаемадзейнічае з польскімі калегамі. Гэта робіць горад натуральнай прасторай сустрэчы і для ўкраінскіх творцаў. У гэтым сэнсе A Possible Home можна разглядаць як прыклад культурнага дыялогу, які нараджаецца з агульнага досведу перамяшчэння і жыцця ў эміграцыі. Мастацтва тут становіцца мовай размовы пра страту і прыналежнасць, салідарнасць і здольнасць будаваць новую супольнасць па-за межамі ранейшага дому.

Арт-рэзідэнцыі Mochnarte з удзелам беларускіх і ўкраінскіх мастакоў

Мастацкія рэзідэнцыі Mochnarte – незалежная ініцыятыва на Падляшшы, заснаваная ў 2022 годзе як прастора для сучасных мастакоў, кураторaў і культурніцкіх дзеячаў з Беларусі, Украіны, Польшчы і іншых краін. Асаблівая ўвага тут надаецца аўтарам у эміграцыі і тым, чыя праца абмежаваная вайной або палітычнымі рэпрэсіямі. За некалькі гадоў у Mochnarte пабывала больш за 50 удзельнікаў, а сама рэзідэнцыя стала месцам для працы, адпачынку, абмену досведам і стварэння новых праектаў.

Украінскія і беларускія мастакі тут працавалі разам з тэмамі памежжа, вайны, страты, міграцыі і памяці. Паказальны эпізод – адначасовае знаходжанне ў рэзідэнцыі беларускага мастака Змітра Жаўнова і ўкраінскай мастачкі Тэрры Нэйдорф: яны размаўлялі на сваіх мовах – беларускай і ўкраінскай, – але лёгка разумелі адно аднаго. Менавіта з гэтага досведу ў Mochnarte ўзнікла ідэя развіваць рэзідэнцыю як платформу для дыялогу паміж беларускімі і ўкраінскімі мастакамі.

Выстава Яўгена Жураўскага «Праз фотаплёнку. Штодзённасць ваяроў» (Варшава, Музей Вольнай Беларусі, 2025 – прастора “Карма”, 2026)

Фотапраект Яўгена Жураўскага, жаўнера Палка Каліноўскага з пазыўным «Салам». З вясны 2023 года ён здымае на плёнку паўсядзённасць беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне – навучанне, чаканне, побыт, кароткія моманты адпачынку і жыццё паміж баявымі задачамі. Аўтар свядома пазбягае гераізацыі і рамантызацыі вайны, паказваючы яе праз звычайны чалавечы досвед.

Праект важны тым, што дакументуе беларускую прысутнасць ва Украіне знутры і ад першай асобы. Гэта гісторыя беларусаў, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у абароне Украіны. Фатаграфія ж становіцца формай сведчання і памяці, якая захоўвае чалавечае вымярэнне вайны і адначасова робіць бачным іншы беларускі досвед – прынцыпова адрозны ад ролі беларускага рэжыму ў расійскай агрэсіі.

«Вышыванка / Выжыванка» Руфіны Базловай для Уладзіміра Зяленскага

У жніўні 2022 года, да Дня Незалежнасці Украіны, Уладзімір Зяленскі з’явіўся ў вышыванцы з арнаментам, створаным беларускай мастачкай Руфінай Базловай. Узор спалучаў традыцыйную мову вышыўкі з вобразамі сучаснай вайны: танкамі, каласамі і людзьмі, якія трымаюцца за рукі.

Такім чынам, традыцыйнае дэкаратыўнае мастацтва было ператворанае ў сродак сучаснага наратыву пра вайну, супраціў і еднасць. Для Базловай гэта стала працягам яе мастацкай практыкі *The History of Belarusian Vyzhyvanka*, у якой яна выкарыстоўвае вышыўку для фіксацыі падзей і вобразаў беларускіх пратэстаў 2020 года.

Гэты прыклад асабліва паказальны для беларуска-ўкраінскага кантэксту: беларуская мастачка выкарыстоўвае форму, звязаную з нацыянальнай традыцыяй, каб выказаць салідарнасць з украінскім грамадствам і перанесці досвед сучаснай палітычнай і ваеннай рэальнасці ў мову народнага мастацтва.

Фотавыстава «Полк Каліноўскага: Доўгае падарожжа дадому»

Разам з прэс-службай Палка імя Кастуся Каліноўскага грамада «Каліноўцы» падрыхтавала перасоўную выставу «Полк Каліноўскага: Доўгае падарожжа дадому». У жніўні 2026 года яна была прадстаўленая ў Цэнтры сучаснага

мастацтва Запарожжа, а 8–21 верасня — у Вялікай Лаўрскай званіцы Кіева-Пячэрскай лаўры. У лістападзе выстава пераехала ў львоўскі «Будинок воїна», працягнуўшы знаёміць украінскую аўдыторыю з досведам беларускіх добраахвотнікаў.

Экспазіцыя паказвае баявы шлях і штодзённасць беларускіх добраахвотнікаў: трэніроўкі, побыт, жыццё на пазіцыях і памяць пра загінулых. Важным элементам мастацкага рашэння сталі кардонныя скрынкі, якія суправаджалі вайскоўцаў падчас пераездаў. Яны ўвасабляюць страту дому, вымушаную мабільнасць і надзею на вяртанне ў Беларусь. Пасля паказу ў Запарожжы пакінутыя наведнікамі шаўроны, значкі і подпісы на скрынках сталі часткай наступнай экспазіцыі.

Выстава прадстаўляе беларускіх добраахвотнікаў праз іх асабістыя гісторыі і досвед. Так дакументальная фатаграфія становіцца сродкам захавання памяці і размовы з украінскай аўдыторыяй пра беларускую прысутнасць у супольнай барацьбе за свабоду.

Фестывалі і прасторы для дыялогу

У гэтым раздзеле асабліва добра бачна, што беларуска-ўкраінскі культурніцкі дыялог выходзіць за межы асобных твораў і падзей. Ён фармуецца праз працу з гістарычнай памяццю, адукацыю, моўныя ініцыятывы, гарадскую прысутнасць і стварэнне фізічных месцаў для сустрэч. Важна, што беларуская культура ў гэтых выпадках убудоўваецца ў больш шырокі ўкраінскі грамадскі і культурны кантэкст.

Яшчэ адна прыкметная тэндэнцыя — паступовы пераход ад сімвалічных жэстаў і разавых акцый да больш працяглых форм супрацы. З'яўляюцца ініцыятывы, якія спалучаюць культуру з адукацыяй, медыя, рэзідэнцыямі, захаваннем памяці і практычнай салідарнасцю. Асобнае значэнне маюць пляцоўкі, дзе можна адкрыта гаварыць у тым ліку пра складаныя тэмы — недавер, адказнасць, розныя гістарычныя досведы і будучыню адносінаў.

Урачыстасці ў гонар Бітвы пад Оршай і князя Канстанціна Астрожскага ў Кіеве

У 2023–2025 гадах у Кіева-Пячэрскай лаўры паслядоўна адбываліся мерапрыемствы, прысвечаныя гадавінам Бітвы пад Оршай і памяці князя Канстанціна Астрожскага. У 2023 годзе, да 509-й гадавіны, быў адкрыты мемарыяльны барэльеф у яго гонар; у 2024-м, на 510-ю гадавіну, прайшлі афіцыйныя ўрачыстасці з удзелам мітрапаліта Эпіфанія; а ў 2025 годзе, да 511-й гадавіны, акцэнт быў на сімвалічным і гістарычным вымярэнні памяці – з ліцыямі, ушанаваннем і прэзентацыяй адноўленых харугваў войска Астрожскага.

8 верасня 2026 года традыцыя ўшанавання Аршанскай перамогі працягнулася ў Кіева-Пячэрскай лаўры. У падзеі да 512-й гадавіны бітвы ўдзельнічалі ваяры Палка Каліноўскага, сябры грамады «Каліноўцы» і валанцёры. Урачыстасці пачаліся з паніхіды па беларусах, якія загінулі

ў расейскай вайне супраць Украіны. Каля памятнага барэльефа Канстанціну Астрожскаму на сцяне Успенскага сабора адбылася цырымонія ўручэння ўзнагарод Міжнароднага легіёна ГУР Міністэрства абароны Украіны, пасля якой адкрылася фотавыстава «Полк Каліноўскага: Доўгае падарожжа дадому». Так памяць пра перамогу 1514 года была звязаная з сучасным досведам беларуска-ўкраінскай салідарнасці.

Паслядоўнасць гэтых падзей сведчыць, што памяць пра Бітву пад Оршай і постаць Астрожскага паступова замацоўваюцца ва ўкраінскай культурнай і мемарыяльнай прасторы і разглядаюцца ў тым ліку як частка агульнай украінскай і беларускай гісторыі.

Культурніцкая панэль на Форуме Астрожскіх у Львове (2025)

Беларуска-ўкраінскі Форум імя Астрожскіх у 2025 годзе прайшоў ужо ў чацвёрты раз, але ўпершыню ў яго праграме з'явілася асобная культурніцкая панэль. Форум аб'ядноўвае больш за 100 удзельнікаў з Беларусі, Украіны і іншых еўрапейскіх краін для абмеркавання бяспекі, дэмакратычнага развіцця і будучыні беларуска-ўкраінскіх адносінаў.

Дыскусія «Супраца Украіны і Беларусі ў культуры: дэкаланіяльнае вымярэнне», арганізаваная Беларускай Радай культуры, вывела ў гэты дыялог пытанні мовы, памяці, ідэнтычнасці, агульнай гісторыі і культурнай супрацы.

Важна, што дыскусія дазволіла не толькі зафіксаваць узаемную цікавасць і гатоўнасць да супрацоўніцтва, але і адкрыта прагаварыць праблемы: разбураныя сувязі, недавер, недахоп сістэмнага дыялогу і адсутнасць агульнай стратэгіі. Сам факт з'яўлення такой размовы на буйной беларуска-ўкраінскай інтэлектуальнай пляцоўцы сведчыць пра паступовае пашырэнне культурнага вымярэння двухбаковых адносінаў.

Вуліца Караткевіча ў Кіеве

Вуліца імя Уладзіміра Караткевіча з'явілася ў Кіеве ў рамках шырэйшага працэсу дэкамунізацыі і пераасэнсавання гарадской тапанімікі, які асабліва актывізаваўся пасля пачатку поўнамаштабнай вайны ў 2022-м. Кіеўскія ўлады масава перайменоўвалі вуліцы, пазбаўляючыся ад савецкіх і расійскіх назваў і адначасова звяртаючыся да постацяў, звязаных з украінскай і суседнімі культурамі.

У гэтым кантэксце ў 2022 годзе вуліца ў Пячэрскім раёне ўкраінскай сталіцы, раней названая ў гонар расійскага крытыка Мікалая Дабралюбава, атрымала імя беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Гэта знак павагі да творчасці аўтара, ушанаванне супольных старонак гісторыі (Караткевіч жыў у Кіеве і вучыўся на філалагічным факультэце Кіеўскага ўніверсітэта) і жэст культурнай салідарнасці з беларускім народам. Тут таксама бачым імкненне ўключыць беларускую культурную спадчыну ў больш шырокую ўсходнееўрапейскую прастору памяці.

Вечарыны і акцыі памяці, прымеркаваныя да Ночы паэтаў, у Львове, Харкаве, Кіеве, Адэсе

Пасля падзей 2020 года для беларусаў Ноч паэтаў – сімвалічная акцыя памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій 1930-х гадоў – стала адным з сімвалаў яднання нацыі і супольным інклюзіўным дзеяннем. Пачынаючы з 2021 года, падзеі, прысвечаныя Ночы паэтаў, ладзяцца і ва Украіне.

Памяць пра знішчаную інтэлігенцыю, пра Розстріляне відродження, пра масавыя пахаванні ў беларускіх Курапатах і ўкраінскіх Биківнянські могили нагадвае, што імперскі гвалт не знікае сам па сабе, а памяць становіцца формай супраціву і ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Для беларусаў і ўкраінцаў гэты досвед агульны: ён вучыць бачыць каштоўнасць чалавечага жыцця і свабоды, распазнаваць пагрозы аўтарытарызму, не дазваляць сцерці праўду і салідарна абараняць культуру і мову.

Культурніцкая ініцыятыва ДЗЕЯ ва Украіне

ДЗЕЯ — беларуская культурніцкая і грамадская ініцыятыва ва Украіне, якая гуртуе беларусаў і ўкраінцаў праз паэтычныя вечарыны, моўныя сустрэчы, лекцыі, кінапаказы, ушанаванне памяці і ўдзел у гарадскіх фестывалях. Яе дзейнасць стварае прастору для непасрэдных сустрэч, знаёмства з беларускай культурай і супольнага асэнсавання гістарычнага досведу дзвюх краін.

Адзін з кірункаў гэтай працы – Ноч паэтаў, прысвечаная памяці беларускіх літаратараў, знішчаных падчас сталінскіх рэпрэсій. У 2026 годзе падзеі да Ночы паэтаў прайшлі ў трох гарадах Украіны: Кіеве, Запарожжы і Львове. У кіеўскую праграму ўвайшлі размова пра загінулых літаратараў і паралелі ў беларускай і ўкраінскай гісторыі, а таксама адкрыты мікрафон з чытаннем паэзіі і прозы пад музычны акампанемент. Такія сустрэчы збліжаюць беларускую памяць пра расстраляных паэтаў з украінскай памяццю пра «Расстралянае адраджэнне», дазваляючы гаварыць пра агульны досвед знішчэння нацыянальных культур і захавання іх спадчыны.

Іншы рэгулярны фармат – сустрэчы да Міжнароднага дня роднай мовы. Напрыклад, 21 лютага 2026 года ДЗЕЯ разам з грамадой «Каліноўцы» запрашала на сустрэчу ў кіеўскай галерэі «Триптих Арт». Праграма спалучала лекцыю пра станаўленне і адметнасці сучаснай беларускай мовы, супольную дыктоўку і квіз.

Важнае месца ў дзейнасці ініцыятывы займае марш памяці беларускіх добраахвотнікаў, прымеркаваны да дня нараджэння Героя Нябеснай Сотні Міхася Жызнеўскага, 26 студзеня. Жызнеўскі — удзельнік Рэвалюцыі годнасці і адзіны грамадзянін Беларусі, удастоены звання Героя Украіны, якое яму прысвоілі пасмяротна ў 2017 годзе. Марш у Кіеве ўшаноўвае яго і іншых беларусаў, якія загінулі за Украіну, і яднае беларускую і ўкраінскую супольнасці вакол памяці і салідарнасці.

Больш нефармальны спосаб сустрэчы культур — беларуская «Кропка Ў» на Фестывалі дзеруноў у 2023, 2024 і 2025 гадах. ДЗЕЯ выступіла

ініцыятарам беларускай прысутнасці на фестывалі, дзе «Кропка Ў» прадстаўляла беларускія дранікі. Фестываль меў таксама дабрачынную мэту: частка прыбытку ад кожнай кропкі скіроўвалася на актуальныя зборы для ўкраінскага войска.

Культурніцкая і асветніцкая дзейнасць грамады «Каліноўцы»

Грамада «Каліноўцы», якая аб'ядноўвае ветэранаў Палка Каліноўскага, іх сем'і і прыхільнікаў беларускага грамадскага руху ва Украіне, развівае таксама культурніцкую і асветніцкую дзейнасць. Яе сустрэчы знаёмяць украінскую аўдыторыю з беларускай літаратурай і гісторыяй, ствараючы прастору для размовы пра сувязі паміж дзвюма краінамі.

23 красавіка 2026 года грамада «Каліноўцы» разам з ініцыятывай ДЗЕЯ арганізавала ў Цэнтры сучаснага мастацтва Запарожжа сустрэчу, прысвечаную Змітраку Бядулю. Размова пра яго жыццёвы і літаратурны шлях спалучалася з абмеркаваннем нацыянальнага адраджэння 1920-х гадоў. Апроч беларускіх добраахвотнікаў, да сустрэчы далучыліся мясцовыя жыхары, для многіх з якіх гэта было першае знаёмства з пісьменнікам.

Яшчэ адзін прыклад — арганізаваная грамадой лекцыя ўкраінскага гісторыка Уладзіслава Старадубцава. Яна была прысвечаная перасячэнням беларускіх і ўкраінскіх рэвалюцыйных рухаў, сувязям БНР і УНР, фармаванню нацыянальных войскаў і супрацы ў дыяспары. Такія падзеі дапамагаюць разглядаць беларускую і ўкраінскую гісторыю ва ўзаемасувязі і абмяркоўваць яе значэнне для сучасных адносінаў.

«Дом Вольнай Беларусі» ў Львове

Пляцоўка, што распачала працу ў Львове ў верасні 2024 года па ініцыятыве беларускай супольнасці і кіраўніка дабрачыннага фонду «Вільна Беларусь» Аляксея Францкевіча. Францкевіч шмат гадоў займаецца беларускім грамадскім актывізмам ва Украіне: у 2020 годзе ён быў сярод ініцыятараў Беларускага крызіснага цэнтра ў Львове, а пасля пачатку поўнамаштабнай вайны – фонду «Вільна Беларусь». Ён дапамагае беларускім добраахвотнікам у складзе УСУ, падтрымлівае беларусаў, якія засталіся ва Украіне, займаецца папулярызацыяй беларускай мовы і беларускай прысутнасці ва ўкраінскай публічнай прасторы.

«Дом Вольнай Беларусі» спалучае грамадскую, культурную і мемарыяльную функцыі. Тут праходзяць культурныя і грамадскія мерапрыемствы, працуе музейная экспазіцыя «Вольная Беларусь з Украінай у сэрцы», прысвечаная, у прыватнасці, беларусам, якія загінулі, абараняючы Украіну.

Значэнне гэтай пляцоўкі ў тым, што яна стварае фізічную прастору пастаяннага кантакту паміж беларусамі і ўкраінцамі. Яна не толькі захоўвае памяць пра беларускі ўдзел у абароне Украіны, але і робіць беларускую прысутнасць бачнай у гарадской прасторы Львова.

Курсы беларускай мовы ў Львове

Праект, распачаты яшчэ ў 2021 годзе як ініцыятыва Беларускага крызіснага цэнтра ў Львове пры падтрымцы ўкраінскай скаўцкай арганізацыі «Пласт». Спачатку створаныя найперш для беларусаў, якія пасля рэпрэсій 2020 года апынуліся ва Украіне і хацелі б вярнуцца да роднай мовы, але на заняткі прыходзілі і ўкраінцы. Пасля пачатку поўнамаштабнай вайны курсы былі прыпыненыя, а ў 2024 годзе адноўленыя ўжо ў Доме Вольнай Беларусі. Цяпер яны праходзяць бясплатна па нядзелях; выкладае праваабаронца, філолаг і журналіст Андрэй Мядзведзеў.

Тут дадаецца яшчэ адзін важны пласт. Беларуская мова ва Украіне – гэта не толькі мова эмігранцкай супольнасці, але і мова нацыянальнай меншасці, якая мае права на захаванне і развіццё. Больш за тое, Украіна афіцыйна ўключыла беларускую ў пералік моў нацыянальных меншасцяў, на якія распаўсюджваецца Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцяў. А ў 2024 годзе ўрад Украіны асобна ўнёс беларускую мову ў пералік моў нацыянальных меншасцяў і карэнных народаў, якім пагражае знікненне. Гэта азначае, што гаворка ідзе не толькі пра культурную сімпатыю да беларускай мовы, але і пра патрэбу яе рэальнага захавання, навучання і перадачы наступным пакаленням.

Fem.Cultural Network і яе праекты

Fem.Cultural Network – беларуска-ўкраінская фемінісцкая культурніцкая ініцыятыва, якая выросла са шматгадовай супрацы ў сферах медыя, адукацыі і культуры.

Адным з ранніх сумесных праектаў стаў MediaLabFem / «Яе справа / Її справа» (2021), у межах якога маладыя журналісткі з Беларусі і Украіны стваралі партрэтныя гісторыі грамадска актыўных жанчын. У 2022 годзе праца працягнулася праз Female Freedom Film Festival у Берліне, Тбілісі і Чарнаўцах. У 2024 годзе ў Берліне адкрыўся Fem*HUB Bridging Cultures – культурніцкая і працоўная прастора для жанчын і квір-людзей з Беларусі і Украіны, а таксама HerLibrary – бібліятэка з больш як 400 кнігамі аўтарак з абедзвюх краін і іншых культурных кантэкстаў. У 2025–2026 гадах да гэтай лініі дадаліся літаратурная лабараторыя і рэзідэнцыя для маладых аўтарак з Беларусі і Украіны, якія працуюць з досведам вайны, выгнання і страты дому.

У адрозненне ад асобных разавых культурных падзей, Fem.Cultural Network фармуе доўгатэрміновую інфраструктуру беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння. Яе асаблівасць — спалучэнне культуры, адукацыі, фемінісцкай перспектывы і працы з досведам міграцыі і вайны.

Фестываль дакументальнага кіно «1084. На мяжы» (2022 і 2023)

Фестываль дакументальнага кіно пра Беларусь і Украіну быў запушчаны пасля пачатку поўнамаштабнай вайны ў кантэксце новай рэальнасці рэгіёна (арганізатар – “Звяно/Ланка”). 1084 км – даўжыня мяжы паміж Беларуссю і Украінай, гэтая лічба ў назве – сімвал разрыву і сувязі адначасова.

Фестываль праходзіў ва Украіне: паказы і дыскусіі адбыліся ў Кіеве, Бучы, Адэсе, Тэрнопалі і Луцку. Усе мерапрыемствы былі бясплатнымі, а ахвяраванні накіроўваліся на закуп расходных матэрыялаў для VAC-тэрапіі ран ва ўкраінскіх ваенных і грамадзянскіх шпіталях.

Важнасць «1084. На мяжы» – у спалучэнні культурнай праграмы з непасрэднай практыкай салідарнасці. Фестываль выкарыстоўваў кіно як спосаб гаварыць пра Беларусь і Украіну ў час вайны, адначасова ствараючы рэальны механізм падтрымкі.

Форум беларускага культурнага супрацоўніцтва ў Луцку (2023)

Дыскусійная праграма была задумана як суправаджальная частка фестывалю «1084. На мяжы», але ў выніку перарасла ў асобную буйную падзею. Яна дала беларускаму і ўкраінскаму бакам магчымасць не толькі глядзець і абмяркоўваць дакументальнае кіно, але і адкрыта размаўляць пра вайну, адказнасць, траўмы і будучыню адносінаў паміж двума грамадствамі.

Значэнне форуму — у стварэнні прасторы для непасрэднага дыялогу ў сітуацыі, калі на міждзяржаўным узроўні адносіны Беларусі і Украіны былі істотна ўскладненыя. Культура ў гэтым выпадку выступіла не проста тэмай абмеркавання, а механізмам аднаўлення гарызантальных сувязяў, выпрацоўкі ўзаемнага разумення і пераадолення недаверу.

«За нашу і вашу свабоду» — выстава беларускай нацыянальнай сімволікі, вайсковай формы і ўзнагарод беларускага вызваленчага руху

Выстава, адкрытая 19 верасня 2026 года ў Нацыянальным музеі гісторыі Украіны ў Другой сусветнай вайне ў Кіеве, арганізаваная сумесна з беларускай Геральдычнай радай «Пагоня» да 35-годдзя прыняцця бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня» ў якасці дзяржаўных сімвалаў Беларусі. Экспазіцыя прадстаўляе гісторыю беларускай дзяржаўнасці і нацыянальна-вызваленчага руху праз сімволіку — ад часоў Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага, Беларускай Народнай Рэспублікі і Слуцкага паўстання да сучасных беларускіх добраахвотнікаў, якія абараняюць Украіну. Сярод экспанатаў — гістарычныя і сучасныя сцягі, вайсковая форма, дзяржаўныя ўзнагароды, праекты нацыянальнай сімволікі, пашпарта і вайсковай атрыбутыкі будучай дэмакратычнай Беларусі. Выстава падкрэслівае беларуска-ўкраінскую салідарнасць і ролю беларускіх добраахвотнікаў у абароне Украіны, выкарыстоўваючы нацыянальную сімволіку як мову гістарычнай памяці, ідэнтычнасці і супольнай барацьбы за свабоду.

Беларуска-ўкраінскі кірунак працы Бібліятэкі і музея імя Францішка Скарыны ў Лондане (2022–2026)

Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Лондане развівае супрацоўніцтва з украінскімі культурніцкімі і навуковымі інстытуцыямі, скіраванае на захаванне і папулярызацыю літаратурнай і гістарычнай

спадчыны абедзвюх краін. У красавіку 2026 года сумесна з Украінскай бібліятэкай і архівам імя Тараса Шаўчэнкі быў арганізаваны міжнародны сімпозіум «Неадступная песня», прысвечаны 90-годдзю Веры Рыч (1936–2009) — брытанскай паэткі і перакладчыцы беларускай і ўкраінскай літаратуры на англійскую мову. Сімпозіум стаў пляцоўкай для асэнсавання яе ўнёску ў міжнароднае прадстаўленне дзвюх літаратур і развіццё беларуска-ўкраінскіх культурных сувязяў. Праграма сімпозіума і відэазапісы выступаў.

Яшчэ адзін кірунак — удзел у міжнародным праекце «Беларуская палітыка і грамадства» сумесна з канфедэрацыяй амерыканскіх універсітэцкіх бібліятэк Ivy Plus Libraries Confederation, у тым ліку бібліятэкамі Гарвардскага, Стэнфардскага і Чыкагскага ўніверсітэтаў. Праект прадугледжвае сістэматычнае архіваванне беларускіх сайтаў, Telegram-каналаў і іншых лічбавых крыніц, у тым ліку матэрыялаў пра рэакцыю беларускага грамадства на расійскае ўварванне ва Украіну, беларускую салідарнасць з украінцамі і ролю Беларусі ў вайне. Ініцыятыва дазваляе захаваць уразлівыя лічбавыя сведчанні для будучых даследаванняў і дакументавання сучаснай гісторыі. Абодва кірункі працы бібліятэкі спрыяюць захаванню супольнай культурнай памяці і робяць беларускі і ўкраінскі досвед больш даступным міжнароднай даследчыцкай супольнасці.

Музыка

Музычная сфера дэманструе адну з найбольш жывых форм беларуска-ўкраінскага культурнага ўзаемадзеяння. Тут можна назіраць не толькі выступы беларускіх музыкаў ва Украіне або творы, прысвечаныя падтрымцы Украіны, але і сумесны рэпертуар, беларуска-ўкраінскія калектывы, удзел беларускіх прафесіяналаў ва ўкраінскіх культурных інстытуцыях і пашырэнне беларускай музычнай традыцыі ў міжнародным кантэксце.

Хор «Унія»

Мужчынскі хор «Унія» пасля рэпрэсій 2020 года ператварыўся з беларускага калектыву ў міжнародную музычную супольнасць. У яго складзе разам з беларусамі выступаюць літоўцы, палякі і ўкраінцы. Адным з першых рэакцый хору на пачатак поўнамаштабнай вайны стала выкананне ўкраінскай песні «Ой у лузі червона калина». У сучасным рэпертуары «Уніі» прысутнічаюць таксама беларускія, польскія і ўкраінскія калядкі. Такім чынам, хор стаў прыкладам натуральнага спалучэння беларускай і ўкраінскай музычных традыцый у межах аднаго калектыву.

Маргарыта Ляўчук — музычная і культурніцкая дзейнасць

Оперная спявачка Маргарыта Ляўчук стала адной з самых прыкметных беларускіх музычных постацяў у кантэксце беларуска-ўкраінскай салідарнасці. Яна выконвала ўкраінскі рэпертуар, у тым ліку песню «Черемшина«, удзельнічала ў сумесных музычных праектах з украінскімі артыстамі і выступала перад беларускімі добраахвотнікамі і ўкраінскімі

вайскоўцамі ў межах «Культурнага дэсанту». Цяпер Маргарыта жыве ва Украіне, дзе працягвае сваю творчую і грамадскую дзейнасць. Нядаўна яна таксама распачала серыю відэаролікаў пра жыццё беларускі ва Украіне, у якіх дзеліцца асабістымі назіраннямі, радасцямі і складанасцямі штодзённага жыцця, адаптацыі і ўзаемадзеяння з украінскім грамадствам (праект рэалізуецца пры падтрымцы праграмы ArtPower Belarus). Такім чынам, дзейнасць Ляўчук выходзіць за межы музычнай салідарнасці і становіцца формай культурнага дыялогу, які знаёміць аўдыторыю з рэальным досведам беларускай прысутнасці ў сучаснай Украіне.

Песня і кліп Лявона Вольскага «Героям слава!»

Гэтая песня была запісаная ў першыя тыдні пасля пачатку поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну. У запісе разам з Лявонам Вольскім удзельнічалі беларускія музыкі Юры Стыльскі і Аляксандр Памідораў, польскі музыка Томаш Арганэк і Warsaw Freedom Orchestra. Музыку і першапачатковы тэкст напісаў Вольскі, украінскую версію тэксту падрыхтаваў Вячаслаў Лявіцкі. Самі аўтары вызначалі гэты запіс як свой музычны ўнёсак у падтрымку Украіны і яе барацьбы супраць расійскай агрэсіі.

Гэта быў прамы публічны зварот беларускіх музыкаў да Украіны на ўкраінскай мове. Песня выразна звязвае беларускую культурную прысутнасць з падтрымкай украінскага супраціву і адначасова паказвае міжнародны характар гэтай салідарнасці праз удзел польскіх музыкаў. Яна стала адным з ранніх музычных выказванняў пасля 24 лютага 2022 года, у якіх беларускія артысты адкрыта занялі бок Украіны.

Ірэна Катвіцкая

У 2022 годзе беларуская спявачка і кампазітарка Ірэна Катвіцкая стала пераможцай украінска-брытанскага конкурсу Golden Time Talent, атрымаўшы два дыпломы I ступені — у намінацыях «Фолк-вакал» і «Кампазітар. Вакальная музыка». Для конкурсу яна абрала аўтэнтычны беларускі матэрыял: баладу «Сілязенька» з Паазер'я і ўласную кампазіцыю «Вясна», заснаваную на беларускім фальклорным матэрыяле. Гэты прыклад паказвае беларускую традыцыйную музыку не толькі як сродак салідарнасці, але і як самастойную мастацкую каштоўнасць, прадстаўленую ва ўкраінскім культурным полі.

Віталь Алексяёнак і KharkivMusicFest

Беларускі дырыжор Віталь Алексяёнак быў мастацкім кіраўніком KharkivMusicFest-2022. Пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання фестываль апынуўся пад пагрозай скасавання, аднак арганізатары вырашылі яго правесці — ужо ў ваенных умовах. 26 сакавіка 2022 года адкрыццё адбылося на станцыі харкаўскага метро «Істарычны музей», якая выкарыстоўвалася як сховішча, пад назвай «Канцэрт паміж выбухамі». У праграме гучалі творы Баха, Шуберта, Дворжака і Скарика, а таксама апрацоўкі ўкраінскіх народных песень.

Алексяёнак падкрэсліваў, што фестываль для яго – гэта не толькі канцэрты, але і праява волі да развіцця культуры і грамадзянскай супольнасці. У выніку беларускі дырыжор аказаўся не проста ўдзельнікам украінскага культурнага жыцця, а адным з людзей, якія ў самы цяжкі перыяд дапамаглі захаваць культурную прысутнасць Харкава.

Беларуская сувязь у стварэнні «Hey Hey Rise Up»

Асобны транснацыянальны прыклад — песня Pink Floyd «Hey Hey Rise Up» з удзелам Андрэя Хлыўнюка, запісаная ў 2022 годзе ў падтрымку Украіны. Да яе стварэння ўскосна спрычыніліся заснавальнікі Беларускага Свабоднага тэатра Наталля Каляда і Мікалай Халезін: яшчэ ў 2015 годзе ў межах музычнага фестывалю Staging a Revolution яны звялі Дэвіда Гілмара з музыкамі «Бумбоксу». Пазней гэтая сетка даўніх кантактаў стала адным з фактараў, якія дапамаглі ўзнікнуць новай міжнароднай калабарацыі. У выніку ўкраінскі вакал Хлыўнюка на аснове «Ой у лузі червона калина» стаў цэнтральным элементам кампазіцыі Pink Floyd.

SPIEVY z-pad mosta

Жаночы хор паўстаў у Варшаве ў 2023 годзе, У яго складзе ёсць эмігранткі з Беларусі і Украіны. Хор даследуе і выконвае старадаўнія беларускія жаночыя песні, а таксама рэпертуар культурнага памежжа, у тым ліку песні Украіны, Польшчы і Літвы. Яго дзейнасць выходзіць за межы канцэртнага фармату: хор праводзіць адкрытыя спевы і адукацыйныя імпрэзы, удзельнічае ў рытуальных і перфарматыўных праектах, працуе з сучаснымі музыкамі і мастакамі.

У цэлым музыка паказвае найбольш непасрэдную форму беларуска-ўкраінскага культурнага збліжэння. Яна працуе адначасова як інструмент салідарнасці, прастора сумеснай творчасці і канал прадстаўлення беларускай культуры ва Украіне. Пры гэтым асобныя прыклады — ад «Уніі» да ўдзелу Алексяёнка ў KharkivMusicFest — сведчаць пра паступовы пераход ад разавых акцый падтрымкі да больш устойлівых прафесійных і чалавечых сувязяў паміж беларускімі і ўкраінскімі музычнымі супольнасцямі.

Песня ўкраінскага музыкі Дзмітрыя Мітусава «Колискова» (“Калыханка”) у сумесным выкананні з беларускім гуртом Dzieciuki (2026)

Беларуска-ўкраінскі музычны праект, рэалізаваны на сяброўскіх і валанцёрскіх пачатках. Беларускі музыкант Алесь Дзянісаў, лідар гурта Dzieciuki, разам з украінскім музыкам з Кіева Дзмітрыем Мітусавым стварылі супольную версію песні, якую прэзентавалі на фестывалі беларускай музыкі Graj у Варшаве ў верасні 2026 года. Ініцыятыва стала прыкладам непасрэднага творчага супрацоўніцтва беларускіх і ўкраінскіх музыкаў, заснаванага на асабістых сувязях, узаемнай падтрымцы і культурнай салідарнасці.

Дабрачынны канцэрт Сяргея Башлыкевіча ў Кіеве ў 2026 годзе

18 верасня 2026 года ў Кіеве адбыўся дабрачынны канцэрт Сяргея Башлыкевіча, лідара гурта Leibonik. Гэта быў першы канцэрт беларускага музыкі ва Украіне пасля пачатку поўнамаштабнага расейскага ўварвання. Дзякуючы канцэрту ўдалося закрыць збор на патрэбы Палка Каліноўскага.

Падзея спалучыла жывую беларускую музыку з практычнай падтрымкай абароны Украіны. Прыезд выканаўцы стаў жэстам асабістай салідарнасці і нагодай для непасрэднай сустрэчы са слухачамі.

Тэатр

У тэатральных праектах на першы план выходзіць не столькі прадстаўленне дзвюх культур побач, колькі стварэнне агульнай прасторы перажывання і выказвання. Вайна, эміграцыя, страта дому, рэпрэсіі і памяць становяцца тэмамі, з якімі беларускія і ўкраінскія ўдзельнікі працуюць разам. Менавіта гэта робіць тэатр асабліва важным фарматам: ён дазваляе не проста распавядаць пра розны досвед, а супастаўляць яго, пражываць калектыўна і ператвараць у супольны мастацкі матэрыял.

Яшчэ адна істотная рыса гэтага раздзела — шматмоўнасць і змяшанасць культурных кодаў. Беларуская, украінская, польская, руская і англійская мовы існуюць у адной сцэнічнай прасторы, часта без жорсткага падзелу паміж «сваім» і «чужым». Гэта дакладна адлюстроўвае рэальнасць эміграцыі і жыцця паміж некалькімі краінамі, а таксама паказвае культурную супольнасць як складаную, рухомую і шматгалосую.

Пры гэтым частка праектаў ужо выходзіць за межы асобных пастановак і пачынае фармаваць больш працяглыя сувязі і супольнасці. Асабліва важна, што ў гэты працэс уключаюцца не толькі прафесійныя артысты, але і дзеці, падлеткі, бежанцы, людзі з асабістым досведам вайны і рэпрэсій. У такім выпадку сцэна становіцца не толькі месцам паказу, але і прасторай адаптацыі, узаемнай падтрымкі і стварэння новых сувязяў.

«Дзікае паляванне караля Стаха»: беларуска-ўкраінская тэатральная калабарацыя

Опера «Дзікае паляванне караля Стаха» Беларускага Свабоднага тэатра стала яскравым прыкладам жывой беларуска-ўкраінскай культурнай супрацы ва ўмовах вайны і выгнання. Разам з беларускімі акторамі на сцэну выходзілі ўкраінскія оперныя спевакі (галоўныя партыі выканалі ўкраінцы Андрэй Бандарэнка і Тамара Калінкіна), дырыжорам быў Віталь Алексяёнак – беларус, які меў досвед супрацы з Харкаўскім оперным тэатрам. Пастаноўка была намінаваная на галоўную брытанскую тэатральную ўзнагароду Olivier Awards.

Спектакль “Па што ідзеш, воўча?” – тэатральная пастаноўка на аснове аповесці беларускай аўтаркі Евы Вежнавец

Праект аб’яднаў беларускіх актрыс Святлану Зелянкоўскую і Яўгенію Кульбачную, украінскую актрысу Вольгу Грыгараш і польскую актрысу Моніку Давідзюк, а польская рэжысёрка Моніка Дабраўлянска выбудавала дзею як шматмоўны праект пра памежжа і агульны досвед рэгіёна. Ідэя нарадзілася ў творчай лабараторыі InexKult «Мультылінгвізм на сцэне», пасля чытак у Варшаве і Берліне адбылася прэм’ера ў Беластоку, спектакль паказалі таксама ў Варшаве і на тэатральным фестывалі ў Авіньёне.
На сцэне гучыць пяць моў (беларуская, украінская, польская, ангельская і руская), адметна, што мовы не падзеленыя “па ролях” і не з’яўляюцца характарыстыкай пэўнага персанажу, а пераплятаюцца. Гэта адлюстроўвае змяшаную ідэнтычнасць рэгіёна, досвед міграцыі і выгнання, камунікацыю праз розныя культурныя коды.

«Маці. Песня падчас вайны»: агульны жаночы голас Беларусі, Украіны і Польшчы

Спектакль, створаны рэжысёркай Мартай Гурніцкай разам з хорам з 21 жанчыны з Украіны, Беларусі і Польшчы. У аснове – рэальныя гісторыі маці і дзяцей, закранутых вайной: уцякачак з Марыупаля, Кіева, Ірпеня, Харкава, а таксама жанчын, якія дапамагалі ім. Спектакль пабудаваны як калектыўны хор – жанчыны спяваюць, скандуюць і прамаўляюць тэксты на розных мовах, спалучаючы народныя песні, асабістыя сведчанні і сучасныя выказванні. Гэта таксама палітычнае выказванне пра вайну з жаночай перспектывы: пра гвалт, страх, адказнасць і спосабы выжывання.

«Як справы»: беларуска-ўкраінскі тэатр сведчанняў пра вайну

Спектакль «Як справы» (How are you) стварыў ў Варшаве **Team Theatre** – група артыстаў-бежанцаў з Беларусі і Украіны. Прэм’ера адбылася ў маі 2022 года, а ў лютым 2023 года спектакль быў паказаны на сцэне TR Warszawa. Пастаноўка пабудаваная на асабістых успамінах і сведчаннях людзей, якія перажылі вайну, у тым ліку з Кіева, Вінніцы, Бучы і Марыупаля. Спектакль ідзе на беларускай, украінскай і рускай мовах. Такім чынам, беларускі і ўкраінскі досвед вымушанай міграцыі і вайны ўпершыню апынуліся ў адной дакументальнай тэатральнай прасторы.

«Postchildhood. Postescape»: беларуска-ўкраінскі досвед вачыма падлеткаў

Беларускі Свабодны тэатр у Варшаве стварыў спектакль «Postchildhood. Postescape» з удзелам вучняў тэатральнай школы Free Artist – падлеткаў з Беларусі і Украіны, якія апынуліся ў эміграцыі. Спектакль быў пабудаваны на іх асабістых гісторыях. Частка ўдзельнікаў стала «двойчы бежанцамі»: спачатку яны пакінулі Беларусь праз рэпрэсіі, а пасля апынуліся ва Украіне, дзе іх сем’і знайшлі прытулак, і зноў былі вымушаныя ўцякаць праз расійскае

ўварванне. Так тэатр стаў прасторай, дзе беларуская і ўкраінская моладзь разам пераасэнсоўвае досвед выгнання, вайны і сямейных адносінаў.

«Купалінка»: беларуска-ўкраінская тэатральная супольнасць у Варшаве

Тэатр і школа «Купалінка» ўзніклі ў Варшаве як беларуская ініцыятыва, але пасля пачатку поўнамаштабнай вайны да яе далучыліся ўкраінскія дзеці і дарослыя. Сёння групы аб'ядноўваюць беларусаў і ўкраінцаў розных узростаў, а спектаклі выкарыстоўваюць беларускую і ўкраінскую мовы, жэсты і рух як сродкі ўзаемнага разумення. Такім чынам, «Купалінка» перарасла фармат асобнага тэатральнага праекта і стала пастаяннай беларуска-ўкраінскай культурнай інфраструктурай у эміграцыі.

Высновы і рэкамедацыі

Мапінг паказвае, што пасля 2022 года беларуска-ўкраінская культурная супраца не знікла разам з фактычным спыненнем міждзяржаўных кантактаў. Наадварот, яна перайшла ў гарызантальны і дэцэнтралізаваны фармат, заснаваны на прафесійных і асабістых сувязях аўтараў, перакладчыкаў, куратараў, журналістаў, актывістаў і незалежных арганізацый. Каля паўсотні выяўленых праектаў у літаратуры, медыя, візуальным мастацтве, тэатры, музыцы, адукацыі і мемарыяльных практыках сведчаць, што гэта ўжо не сукупнасць адзінкавых жэстаў салідарнасці, а рэальнае і разнастайнае поле культурнай супрацы.

Пры гэтым змянілася і сама якасць гэтага ўзаемадзеяння. У цэнтры многіх праектаў – не проста ўзаемнае знаёмства дзвюх культур, а супольнае асэнсаванне вайны, рэпрэсій, выгнання, страты, памяці, мовы і адказнасці. Асаблівую ролю адыгрывае пераклад: украінская літаратура ўваходзіць у беларускую культурную прастору, беларуская — ва ўкраінскую, а разам з тэкстамі перадаюцца спосабы апісання і асэнсавання ўласнага досведу. Паралельна ўзнікаюць больш устойлівыя формы супрацоўніцтва — рэзідэнцыі, архівы, бібліятэкі, медыя, адукацыйныя курсы, супольнасці і фізічныя культурныя пляцоўкі. Такім чынам, супраца стварае не толькі асобныя культурныя прадукты, але і новыя сувязі паміж людзьмі і інстытуцыямі.

Галоўная праблема пры гэтым — разрыў паміж маштабам зробленага і ўзроўнем яго сістэмнай падтрымкі. Значная частка праектаў паўстала дзякуючы валанцёрскай працы, асабістым сродкам, краўдфандынгу або невялікім грантам, часта ў межах праграм, якія не ставілі беларуска-ўкраінскае супрацоўніцтва сваёй асноўнай мэтай. Такая мадэль даказала сваю жыццяздольнасць, але застаецца ўразлівай: занадта шмат залежыць ад асобных людзей, іх асабістых рэсурсаў і здольнасці працягваць працу ва ўмовах вайны, рэпрэсій і эміграцыі. Таму наступным этапам павінна стаць не проста павелічэнне колькасці супольных падзей, а пераход ад кропкавай праектнай логікі да доўгатэрміновай праграмы, якая падтрымлівала б пераклады і выданні, рэзідэнцыі, мабільнасць, супольныя даследаванні, медыя- і адукацыйныя праекты, архіваванне ўжо зробленага, а таксама

доўгатэрміновую працу з аўдыторыямі. Асобным напрамкам павінна стаць падтрымка новых беларуска-ўкраінскіх прафесійных сетак і супольнасцяў, якія ўзнікаюць не толькі вакол асобных праектаў, але і як працяглыя формы супрацоўніцтва.

Яшчэ адзін істотны дэфіцыт — недахоп сталых пляцовак для размовы пра самі рамкі беларуска-ўкраінскіх адносінаў. Патрэбныя не толькі супольныя культурныя прадукты, але і рэгулярныя пляцоўкі для абмеркавання складаных пытанняў гістарычнай памяці, мовы, узаемнага ўспрымання і будучыні адносінаў паміж дзвюма культурнымі супольнасцямі. Асобныя прыклады ўжо існуюць (Форум беларускага культурнага супрацоўніцтва ў Луцку, культурная панэль Форуму Астрожскіх і іншыя ініцыятывы), але пакуль яны застаюцца хутчэй асобнымі выпадкамі, чым сталай інфраструктурай дыялогу.

Такі дыялог патрэбны на некалькіх узроўнях: паміж даследчыкамі, куратарамі, аўтарамі, журналістамі і культурнымі інстытуцыямі; паміж прафесійнымі супольнасцямі; а таксама ў шырэйшай публічнай прасторы. Асабліва важна, каб дэкаланіяльны падыход не заставаўся мовай вузкага экспертнага асяроддзя. Яго варта перакладаць у даступныя для шырокай аўдыторыі фарматы: медыя, падкасты, адукацыйныя праграмы, адкрытыя дыскусіі, сумесныя даследаванні, літаратурныя і мастацкія праекты. Гэта дазволіць перайсці ад рэакцыі на асобныя крызісы да больш свядомага і доўгатэрміновага фармавання культуры ўзаемнага разумення.

У сітуацыях, дзе прамая камунікацыя ўскладненая праз назапашаны недавер, розніцу палітычных кантэкстаў або адсутнасць бяспечнай нейтральнай прасторы, еўрапейскія культурныя інстытуцыі могуць выступаць фасілітатарамі і пасярэднікамі. Іх роля можа заключацца ў тым, каб даваць пляцоўку, рэсурс, экспертызу і ўмовы для працяглай прафесійнай камунікацыі. Важна, каб такое пасярэдніцтва не падмяняла беларускія і ўкраінскія галасы, а, наадварот, падтрымлівала непасрэдны дыялог і дапамагала рабіць яго больш устойлівым і роўным.

Такім чынам, беларуска-ўкраінскую культурную супрацу не трэба ствараць з нуля, бо яе аснова ўжо існуе. Яна сфармавалася з асобных ініцыятыў, прафесійных сувязяў, супольнасцяў і інстытуцыйных практык, якія ўзніклі ў апошнія гады. Сам мапінг дазваляе ўбачыць іх не як набор разрозненых выпадкаў, а як элементы экасістэмы культурнага ўзаемадзеяння, якая фармуецца проста на нашых вачах.

Наступная задача — стварыць для гэтай экасістэмы неабходныя ўмовы для развіцця: доўгатэрміновы рэсурс, механізмы падтрымкі, прафесійныя сеткі, пляцоўкі для рэгулярнага дыялогу і стратэгічную рамку. Пры гэтым важна не інстытуцыялізаваць супрацу «зверху», а ўзмацніць тыя гарызантальныя сувязі і ініцыятывы, якія ўжо даказалі сваю жыццяздольнасць. Менавіта яны могуць стаць асновай новай мадэлі беларуска-ўкраінскіх культурных адносінаў — больш роўнай, дэкаланіяльнай, суб'ектнай і арыентаванай не толькі на рэакцыю на крызісы, але і на супольнае фармаванне будучыні.

У гэтым сэнсе мапінг — не толькі фіксацыя зробленага, але і адпраўны пункт для наступнага этапу. Ён паказвае, што неабходны чалавечы і прафесійны патэнцыял ужо існуе. Пытанне цяпер не ў тым, ці магчыма беларуска-ўкраінскае культурнае супрацоўніцтва, а ў тым, як стварыць умовы, каб яно стала ўстойлівай і доўгатэрміновай часткай адносінаў паміж дзвюма культурнымі супольнасцямі.

Даклад падрыхтаваны экспертамі Беларускай рады культуры сумесна з Дацкім культурным інстытутам, 2026

Ёсць пытанні, ідэі ці каментары?

Будзем рады вашаму фідбэку і прапановам па далейшым развіцці даследавання.

Кантакт: info@byculture.org